# СПАРТЫЎНЫЯ ДАСЯГНЕННІ АТЛЕТАЎ

Студэнт факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій нашай альма-матар Іван Гарохаў пасляхова выступае на спаборніцтвах па цяжкай атлетыцы. На чэмпіянаце Віцебскай вобласці, які праходзіў у пачатку верасня на базе Наваполацкага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву, Іван заняў другое месца ў вагавой катэгорыі +105 кілаграм. А на чэмпіянаце Рэспублікі Беларусь па цяжкай атлетыцы, што адбыўся напрыканцы верасня ў Гродне, у асабістым заліку спартсмен стаў трэцім у вагавой катэгорыі +105 кілаграм. Да таго ж зборная каманда Віцебскай вобласці атрымала ўпэўненую перамогу ў камандным заліку сярод мужчын.